5. Рожков, И. Я. Международное рекламное дело / И. Я. Рожков. – М.: Банки и биржи, 1994. – 175 с.

6. О рекламе: Закон Республики Беларусь: принят Палатой представителей 2 апреля 2007 года: одобрен Советом Республики 20 апреля 2007 года. – Минск: БДП. – 29 с.

Шашкова К.Д., студент 450 групы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Лупашко И.Г.,
кандидат культурологии, доцент

## АРТ-ТУРЫЗМ ЯК ПЕРСПЕКТЫЎНЫ КІРУНАК ТУРЫЗМУ

Яшчэ з старажытных часоў мастацтва вызначалася як важная самастойная форма мыслення, рэпрэзентацыі і самавыяўлення, а дасягненні, адкрыцці і распрацоўкі ў гэтых кірунках прыцягвалі людзей наведваць суседнія і нават вельмі аддаленыя гарады і рэгіёны. У гэтым працэсе ўдзельнічалі як прафесійныя мастакі, архітэктары, дызайнеры, калекцыянеры, так і звычайныя людзі, якія імкнуліся да самаўдасканалення. Сучасныя турысты таксама падарожнічаюць па розных кутках свету, каб убачыць і даследаваць новыя і ўнікальныя напрамкі мастацтва [10].

У сусветнай практыцы сучаснае мастацтва (contemporary art) трактуецца як актуальнае мастацтва, якое адбываецца «тут і цяпер» [1]. Праблема ўспрымання сучаснага мастацтва ва ўмовах імклівага рытму жыцця актуалізуе патрэбу пошуку эфектыўных спосабаў яго асэнсавання, засваення, папулярызацыі.

Большасць айчынных даследчыкаў лічаць арт-турызм адным з новых напрамкаў культурнага турызму. Існуюць розныя класіфікацыі культурнага турызму. У залежнасці ад базавага культурнага рэсурсу вылучаюць: турызм спадчыны (культурна-гістарычны), тэматычны турызм, арт-турызм, падзейны турызм, крэатыўны турызм, экакультурны турызм і інш. [5].

Арт-турызм – від турызму, які звязаны з цікавасцю да бягучых працэсаў у сферы мастацкай творчасці, працэсамі і вынікамі сучаснага мастацтва. Аб'екты і падзеі, якія ўяўляюць цікавасць для арт-турыстаў, вельмі разнастайныя і ўключаюць: наведванне мастацкіх галерэй і выстаў, спектакляў, канцэртаў, фальклорных фестываляў, вулічных паказаў, студый мастакоў, культурна-крэатыўных кварталаў і інш.[3].

Спецыфіка мастацкага турызму заключаецца ў тым, што ён арыентаваны на рэалізацыю патрэбаў турыстаў у творчым самавыяўленні (маляванне, музыцыраванне, літаратурная творчасць, прыкладное мастацтва, фота і кінатворчасць і г.д.) і духоўным развіцці (навучанне розным духоўным практыкам) на аснове іх уласнай практычнай стваральнай дзейнасці.

Вылучаюцца наступныя віды арт-тураў: выставачныя, тэатральныя, музыкальныя, балетныя і г.д. Арт-туры носяць не толькі мастацка-пазнавальны характар, што выяўляецца ў стварэнні ўласных арт-праектаў, але і адукацыйны (наведванне арт-трэнінгаў, арт-семінараў, майстар-класы) і дзелавы (круглыя сталы, канферэнцыі, арт-форумы) характар. Тым самым арт-турызм можа паспяхова сумяшчаць некалькі напрамкаў дзейнасці і з’яўляецца комплексным відам культурнага турызму. Падобныя туры часцей за ўсё распрацоўваюцца на невялікую колькасць чалавек, характарызуюцца тэматычным падборам інфармацыі і выбарам аб'ектаў не па папулярнасці, а па значнасці для турыста: паездкі на археалагічныя раскопкі, майстар-класы, фестывалі і да т.п. [4].

Гістарычныя мясціны, а таксама мастацкія і культурныя ўстановы, такія як галерэі, музеі, тэатры, прадастаўляюць цікавасць для арт-турыстаў. Акрамя таго, падзеі, такія як мастацкія кірмашы, выставы, карнавалы, аўкцыёны і фестывалі, становяцца своеасаблівымі месцамі ўзаемадзеяння паміж турыстамі і мастакамі. Культурныя фестывалі, у сілу свайго тэатральнага характару, як правіла, прыцягваюць больш турыстаў, чым афіцыйныя мастацкія выставы [1].

Музейны турызм таксама дапамагае развіваць рынак арт-турызму. Зразумела, што найперш узнікаюць асацыяцыі з такімі буйнымі музеямі як Луўр, Нацыянальная галерэя ў Лондане, Метрапалітэн музей, музеі Ватыкана ў Рыме, Эрмітаж, Траццякоўская галерэя і інш. [6].

У Беларусі таксама існуюць аб’екты, якія, на наш погляд, могуць адыграць значную ролю ў развіцці арт-турызму. Прывядзем некалькі прыкладаў.

Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь – найбуйнейшы мастацкі збор краіны. У ім сабрана больш за 33 000 адзінак музейных прадметаў з больш чым 132 краін свету, якія распавядаюць пра 12 стагоддзяў гіторыі мастацтва чалавецтва [2].

Сярод мінскіх галерэй можна вылучыць «Арт-Беларусь». У яе зборы знаходзяцца творы мастакоў, якія нарадзіліся ў межах сучаснай Беларусі, такіх як Марк Шагал, Хаім Суцін і інш. На гэтай пляцоўцы штогод праходзіць «Восеньскі салон з Белгазпрамбанкам», які прадстаўляе панараму творчасці маладых беларускіх мастакоў.

Шэраг цікавых арт-аб'ектаў знаходзіцца ў Віцебску: музей і арт-цэнтр Марка Шагала, музей гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча. Акрамя таго, у горадзе з 1992 года праходзіць штогадовы міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар».

Аб'екты арт-турызму знаходзяцца не толькі ў сталіцы і буйных гарадах. Як і іншыя віды турызма, арт-турызм можа з’яўляцца значным складнікам эканамічнага развіцця рэгіёнаў. Мастацтва дапамагае прыцягнуць наведвальнікаў у пэўны рэгіён, спрыяе дабрабыту мясцовай супольнасці [7]. Аднак для гэтага патрабуецца выкананне пэўных умоў: супрацоўніцтва турысцкіх прадпрыемстваў з сучаснымі арт-пляцоўкамі; дадатковыя інвестыцыі для прыцягнення арт-турыстаў; наяўнасць спецыялістаў, якія валодаюць кампетэнцыямі і ў турыстычным бізнэсе, і ў галіне мастацтва.

Мастацкі турызм спрыяе атрыманню выгод не толькі эканамічных, але і сацыяльных: захаванне спадчыны, стварэнне «ўнікальных» ўражанняў з

дапамогай турыстычных прадуктаў, якія ў многіх выпадках складаюцца з твораў мастацтва, узятых у якасці культурных рэсурсаў: ад музеяў, мастацкіх галерэй, культурных мерапрыемстваў да рамесных рынкаў і гарадскога мастацтва на праспектах [8]. У галіну турызму гэта прыносіць стыль, культуру, прыгажосць, у той час як турызм стварае канал, па якім новыя формы мастацтва могуць атрымаць падтрымку (як фінансавую, так і сацыяльную) і дапамагае пашырыць аўдыторыю наведвальнікаў [8].

Арт-турызм прапануе мастацкія праграмы для ўсіх узростаў, мастацтва можа далучаць і звязваць людзей з розных слаёў насельніцтва, а таксама стаць падставай наведаць краіну. Часцей мэтавай аўдыторыяй арт-абмену паміж краінамі з'яўляецца моладзь [6].

Сусветная турысцкая арганізацыя ААН (ЮНВТО) прыкладае намаганні для ўмацавання сектара мастацкага турызму, прапаноўваючы кожны год новыя ініцыятывы, якія прыносяць карысць недаацэненым мастакам і розным формам мастацтва.

Падводзячы вынік, адзначым, што арт-турызм з'яўляецца новым кірункам культурнага турызму, які адрозніваецца шырокім дыяпазонам культурна-пазнавальных рэсурсаў (славутасці, месцы і падзеі, звязаныя з мастацтвам у любой яго праяве) і спецыфічнай скіраванасцю інтарэсаў турыста (патрэба у творчым самавыяўленні на аснове уласнай практычнай стваральнай дзейнасці).

Арт-турызм з'яўляецца перспектыўным напрамкам у Беларусі, з прычыны наяўнасці на тэрыторыі краіны значнай колькасці існуючых і патэнцыяльных аб’ектаў паказа.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Колантаевская, Е.А. Арт-тур как форма культурно-досугового мероприятия, направленного на развитие туристического потенциала территории / Е.А. Колантаевская // Актуальные исследования. – 2023. – №4 (134). – Ч.I. – С. 70-72.

2. Национальный художественный музей Республики Беларусь [Электронны рэсурс] / Национальный художественный музей РБ. – Рэжым доступу: https://artmuseum.by/ru. – Дата доступу: 24.02.2023.

3. Писаренко, С.В. Арт-туризм в Санкт-Петербурге / С.В. Писаренко // Лучшая студенческая статья 2019: сборник статей XXII Международного научно-исследовательского конкурса. – Пенза: МЦНС «Наука и Просвещение». – 2019. – 316 с.

4. Тимиргалеева, Р.Р. Проблемы и перспективы взаимодействия санаторно-курортного и туристского комплексов Республики Крым / Р.Р. Тимиргалеева, Т.В. Куц // Таврический научный обозреватель. – 2016. – №2 (7). – С. 31–36.

5. Черевичко, Т.В. Креативный туризм и цифровизация общества / Т.В. Черевичко, Т.В. Темякова // Известия Саратовского университета. Новая серия. Серия «Экономика. Управление. Право». – 2022. – №22 (2). – С.145–151.

6. Art Tourism And Its Various Forms [Электронны рэсурс] / Myurbanartist. – Рэжым доступу: https://myurbanartist.com/art-tourism-and-its-various-forms/. – Дата доступу: 20.02.2023.

7. Art tourism: A new field for tourist studies [Электронны рэсурс] / Journals.sagepub. – Рэжым доступу: https://journals.sagepub.com/doi/full/10.1177/1468797618815025. – Дата доступу: 22.02.2023.

8. Art, tourism [Электронный рэсурс] / Researchgate. – Рэжым доступу: https://www.researchgate.net/publication/293593198_Art_tourism. – Дата доступу: 22.02.2023.

9. Distinguishing art tourism from cultural tourism [Электронны рэсурс] / Ascasogallery. – Рэжым доступу: https://www.ascasogallery.com/art-tourism/. – Дата доступу: 20.02.2023.

10. Why arts and tourism need each other [Электронны рэсурс] / artshub. – Рэжым доступу: https://www.artshub.com.au/news/sponsored-content/why-arts-and-tourism-need-each-other-2514642352639/#:~:text=The%20 pairing%20of%20arts%20and,local%20areas%20through%20creative%20practice. – Дата доступу: 24.02.2023.

Шевчик Е.О., магистрант
заочной формы обучения
Научный руководитель – Бриткевич Д.В.,
кандидат искусствоведения

## ОБРАЗ СОБАКИ В ЖИВОПИСИ ФЛАМАНДСКИХ ХУДОЖНИКОВ XVI–XVII ВВ.

Фламандская живопись представляет собой крупнейшее явление в искусстве XVI–XVII вв. Художники создавали свои выдающиеся произведения в различных жанрах (натюрморт, пейзаж, портрет, бытовой жанр), многие из которых включали в себя анималистические образы. В частности, художественный образ собаки был ярко воплощен на полотнах мастеров того времени. Так, в творчестве фламандских художников появлялись произведения с ярко выраженными чертами анималистики – жанра, который зарождался и активно развивался. Основной целью авторов, работающих в этом жанре, было желание показать животных: их особенности, породу, повадки и внешние проявления характера, красоту, место в окружающем мире. Выдающиеся фламандские живописцы много и часто писали картины, в которых присутствовал образ собаки, проявляя интерес к анималистическому жанру и, тема самым, влияя на его развитие. Большое количество собак, изображенных на полотнах художников рассматриваемого периода дает возможность оценить актуальность и значимость данного образа в искусстве.